# ПРАГРАМА КААЛІЦЫІ
# КАМАНДА ЛАТУШКІ І РУХ «ЗА СВАБОДУ»

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, АДКАЗНАСЦЬ, СВАБОДА

# Незалежнасць

## 1. Нацыянальная ідэнтычнасць

*Прыняцце праграмы Каардынацыйнай рады па падтрымцы нацыянальнага адраджэння Беларусі. Развіцце культурніцкіх і адукацыйных ініцыятыў. Важна пазіцыяніраванне беларусаў як адметнай нацыі, а не «асобнага гатунку рускіх», як шмат кім успрымаецца ў ЕС дагэтуль.*

## 2. Беларуская мова

*Падтрымка і стварэнне беларускамоўных праектаў. Пашырэнне беларускай мовы ў грамадскім жыцці беларусаў.*

## 3. Нацыянальныя інстытуты і цэнтры

*Спрыянне стварэнню сістэмы ўстойлівага фінансавання з розных крыніц музеяў, тэатраў, іншых грамадска-культурных цэнтраў і інстытутаў беларусаў за мяжой. Падтрымка выкладчыкаў і дзеячоў культуры. Стварэнне культурных ініцыятыў, накіраваных на беларускае грамадства ўнутры Беларусі.*

## 4. Незалежныя СМІ і блогеры

*Лабіяванне павялічэння фінансавай падтрымкі беларускім незалежным СМІ і блогерам у міжнародных інстытутах. Недапушчэнне складвання беларускіх медыяў у адзіны «кошык» фінансавай падтрымкі з расейскімі.*

## 5. Супрацьстаянне “рускаму міру”

*Супрацьдзеянне рускамірскай прапагандзе (інфармацыя, адукацыя, гісторыя, культура). Абгрунтаванне неабходнасці для выжывання беларускай нацыі — сепарацыі ад «рускага міра» і Саюзнай дзяржавы. «Рускі мір» – пагроза існаванню беларускай нацыі і дзяржаўнасці.*

# Салідарнасць

## 1. Беларусы — не рэжым

*Прыняцце базавых дакументаў Каардынацыйнай рады, тэзісаў для сустрэч, якія дэманструюць, што беларусаў неабходна аддзяляць ад рэжыму Лукашэнкі, што беларусы супраць вайны і Лукашэнкі.*

*Правядезнне адпаведнай інфармацыйна-палітычнай кампаніі ў ЕС.*

## 2. Спрашчэнне візавага і памежнага рэжымаў

*Прыняцце рэзалюцыі Каардынацыйнай рады аб неабходнасці спрашчэння візавага і памежнага рэжымаў.*

*Лабіяванне паляпшэння магчымасцяў атрымання беларусамі віз у ЕС. Палітычны лобінг адкрыцця памежных пераходаў для пасажырскага транспарту.*

## 3. Стыпендыі, стажыроўкі і кадравы рэзерв

*Павялічэнне стыпендый, стажыровак для беларускай моладзі ў еўрапейскіх ВНУ. Рэалізацыя праграмы "Кадравы рэзерв". Стварэнне і падтрымка адукацыйных курсаў для падрыхтоўкі будучых кіруючых кадраў для дэмакратычнай Беларусі.*

## 4. Камунікацыя з беларусамі

*Пераадоленне вымушанага падзелу на "тых, хто ад'ехалі і тых, хто засталіся". Забяспячэнне пастаяннай праактыўнай прысутнасці ў інфармацыйным полі ў Беларусі. Павялічэнне каналаў камунікацыі з беларусамі ўнутры краіны і па-за яе межамі. Падтрымка супольнасцей унутры краіны і паляпшэнне зваротнай сувязі.*

## 5. Дапамога ў эвакуацыі

*Садзейнічанне эвакуацыі беларусаў. Падтрымка ініцыятыў, якія займаюцца эвакуацыяй беларусаў. Вырашэнне экстраных візавых пытанняў для мэт эвакуацыі.*

# Адказнасць

## 1. Міжнародны крымінальны суд за злачынства супраць чалавечнасці

*Палітычнае прасоўванне комплексных прававых дзеянняў па перадачы "Беларускай сітуацыі" ў Офіс пракурора Міжнароднага крымінальнага суда па артыкуле 14 Рымскага Статута. Рэалізацыя дазволіць пракурору МКС пачаць расследаванне сітуацыі, звязанай з прымусам грамадзянскага насельніцтва Беларусі пакідаць краіну (дэпартацыяй) у выніку палітычных пераследаў. Ордэр на арышт Лукашэнкі.*

## 2. Міжнародны крымінальны суд за ваеннае злачынства

*Пашырэнне патэнцыялу арганізацый грамадзянскай супольнасці па дакументаванні фактаў вывазу грамадзянскага насельніцтва, у тым ліку непаўналетніх, з акупаваных тэрыторый Украіны ў Беларусь. Садзейнічанне ў перадачы адпаведнай інфармацыі ў Міжнародны крымінальны суд у рамках расследуемай сітуацыі. Ордэр на арышт Лукашэнкі.*

## 3. Трыбунал за агрэсію супраць Украіны за злачынства агрэсіі

*Узаемадзеянне з партнёрамі па забеспячэнні распаўсюджвання юрысдыкцыі будучага трыбунала па злачынстве агрэсіі супраць Украіны на вышэйшае ваенна-палітычнае кіраўніцтва рэжыму Лукашэнкі, у тым ліку самога дыктатара. Ордэр на арышт Лукашэнкі.*

## 4. Універсальная юрысдыкцыя

*Узаемадзеянне з краінамі, якія маюць найбольшы досвед у прымяненні прынцыпу ўніверсальнай юрысдыкцыі для стварэння ўмоў па разглядзе спраў, звязаных са злачынствамі супраць чалавечнасці ў Беларусі.*

## 5. Міжнародны суд ААН за парушэнне Канвенцыі супраць катаванняў

*Пошук партнёра і забеспячэнне падачы ад яго імя заявы ў Міжнародны суд ААН за парушэнне рэжымам Лукашэнкі фундаментальных абавязацельстваў па Канвенцыі супраць катаванняў 1984 года.*

*Стварэнне камітэта Каардынацыйнай рады па пытаннях адказнасці Лукашэнкі і прадстаўнікоў рэжыму за злачынствы супраць беларускага і ўкраінскага народаў.*

# Ціск

## 1. Гарманізацыя гандлёвых санкцый супраць рэжыму і Расіі

*Павышэнне эфектыўнасці санкцыйнай палітыкі праз гарманізацыю гандлевых санкцый супраць рэжыму Лукашэнкі і Расіі. Розніца гандлёвых абмежаванняў паміж рэжымам і Расіяй не толькі дазваляе ўхіляцца ад санкцый праз адкрытыя межы, але і дае магчымасць узбагачэння звязаным з дыктатрамі структурам. Гарманізацыя санкцый накіравана на абмежаванне магчымасцяў Расіі пры падтрымцы Лукашэнкі працягваць агрэсію супраць Украіны. Лабіяванне прыняцця адпаведных рашэнняў ЕС, ЗША і іншымі краінамі.*

## 2. Абмежаванне транзіта санкцыйных тавараў праз Беларусь

*Для ліквідацыі абыхода санкцый праз трэція краіны неабходна забарона транзіту падсанкцыйных тавараў праз Беларусь або ўвядзенне гандлёвых квот ЕС і дэмакартычнымі карінамі з трэцімі краінамі, на даваенным узроўні. Лабіяванне прыняцця адпаведных рашэнняў ЕС, ЗША і іншымі краінамі.*

## 3. Санкцыі за палітзняволеных

*Увядзенне санкцый, накіраваных супраць груп тавараў, аналагі якіх вырабляюцца палітвязнямі ў беларускіх калоніях. Лабіяванне прыняцця адпаведных рашэнняў ЕС, ЗША і іншымі краінамі.*

## 4. Санкцыі супраць Саюзнай дзяржавы

*Увядзенне санкцый у дачыненні да службовых асоб і ўстаноў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, а таксама службовых асоб, якія працуюць на паглынанне Беларусі Расіяй. Лабіяванне прыняцця адпаведных рашэнняў ЕС, ЗША і іншымі краінамі.*

## 5. Персанальныя санкцыі

*Персанальныя санкцыі супраць: прапагандыстаў рэжыму Лукашэнкі, сілавікоў і суддзяў рэжыму, якія адказныя за рэпрэсіі супраць беларусаў, ваенна-палітычнага кіраўніцтва, датычнага да агрэсіі супраць Украіны. Лабіяванне прыняцця адпаведных рашэнняў ЕС, ЗША і іншымі краінамі.*

# Дыяспара

## 1. Легалізацыя і атрыманне дакументаў

*Унясенне прапаноў па паляпшэнні прававога становішча беларусаў. Лабіяванне прыняцця адпаведных рашэнняў і ўнясення зменаў у заканадаўства краін сябраў ЕС.*

## 2. Дапамога палітзняволеным, добраахвотнікам і ветэранам

*Юрыдычная дапамога ў легалізацыі, падтрымка сбора сродкаў, распрацоўка і падтрымка грамадскіх ініцыятыў, накіраваных на дапамогу беларускім палітзняволеным, добраахвотнікам і ветэранам.*

*Прыярэтызацыя фінансавых сродкаў еўрапейскіх партнёраў на падтрымку палітзняволеным.*

*Стварэнне камітэта Каардынацыйнай рады па пытаннях дапамогі ветэранам-добраахвотнікам.*

## 3. Адукацыя

*Садзейнічанне стварэнню беларускіх школ за мяжой, курсаў перакваліфікацыі, паслядыпломнай адукацыі.*

## 4. Беларускі бізнэс

*Адвакатаванне інтарэсаў беларускага бізнэсу за мяжой, спрыянне вырашэнню сістэмных праблем, з якімі сутыкаецца беларускі бізнэс у асобных краінах. Стварэнне камітэта Каардынацыйнай рады па пытаннях адвакатавання інарэсаў беларускага бізнэса за мяжой.*

## 5. Пенсіі і сацыяльная дапамога

*Садзейнічанне вырашэнню праблем пенсійнага і сацыяльнага забяспячэння беларусаў за мяжой. Абгрунтаванне і прасоўванне праграм па падтрымцы сацыяльна неабароненых беларусаў за мяжой.*

# Знешняя палітыка

## 1. Нічога пра нас без нас!

*Адстойванне інтарэсаў Беларусі і беларусаў на міжнароднай арэне. Недапушчэнне сітуацыі, каб лес Беларусі вырашаўся без уліку інтарэсаў беларускага грамадства.* Стварэнне ўмоў для вызвалення беларускіх палітзняволеных.

*Распрацоўка і прыняцце Каардынацыйнай радай стратэгіі знешнепалітычнай дзейнасці.*

## 2. Еўрапейскі выбар

*Правядзенне інфармацыйнай кампаніі для беларусаў аб прывабнасці Еўрапейскага выбару для Беларусі на падставе агульнаеўрапейскай бяспекі, еўрапейскай ментальнасці беларускай нацыі, дэмакратычнага выбару беларускага народу*

## 3. Падтрымка Украіны

*Палітычная і дыпламатычная падтрымка Украіны. Развіцце беларуска-украінскіх адносінаў. Без незалежнай Украіны не будзе незалежнай Беларусі.*

## 4. Група краін стратэгічных партнераў

*Садзейнчанне сварэнню групы краін стратэгічных партнёраў Беларусі і беларускіх дэмакратычных сіл.*

## 5. Міжпарламентскае супрацоўніцтва

*Супрацоўніцтва з групамі сяброў Беларусі ў парламентах дэмакратычных краінаў. Стварэнне новых груп супрацоўніцтва. Лабіяванне інтарэсаў дэмакратычнай Беларусі на міжпарламентскім узроўні. Развіцце адносінаў з Еўрапарламентам, парламенцкай асамблеяй АБСЕ, парламенцкай асамблеяй Рады Еўропы.*

# Будучыня

## 1. Дзяржава для асобы і грамадзяніна

*Галоўная каштоўнасць для будучай Беларусі - гэта асоба і грамадзянін. Беларусы павінны быць гаспадарамі ў сваей краіне, беларускі народ павінен быць суб'ектам, прымаючым галоўныя палітычныя і стратэгічныя рашэнні ў Беларусі. Урад для народа, а не народ для ўрада.*

## 2. Выбарнасць улады

*Крыніцай улады з'яўляецца беларускі народ, і толькі ён валодае выключным правам вырашаць, хто павінен кіраваць дзяржавай на ўсіх узроўнях палітычнай сістэмы. Развіццё мясцовага самакіравання.*

## 3. Бяспека

*Распрацоўка крокаў, накіраваных на забеспячэнне эканамічнай, ваеннай і ўнутранай нацыянальнай бяспекі. Адказнасць прадстаўнікоў праваахоўнай сістэмы, суддзяў , пракурораў, мэраў, дзяржаўных кіраўнікоў на ўсіх узроўнях перад народам — фундамент для ўнутранай бяспекі. Прасоўванне ініцыятывы аб перспектывах ўваходжаня Беларусі ў ЕС.*

## 4. Устойлівая эканоміка

*Праца над стратэгіяй пераходу да новай Беларусі ў галіне забеспячэння эканамічнай стабільнасці і развіцця ў перыяд транзіту ўлады і пераходны перыяд. Фармаванне механізмаў эканамічнага супрацоўніцтва з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі.*

## 5. Раскол эліт, транзіт улады, змена палітычнай сістэмы

*Праца па расколе "эліт" для далейшага падрыхтаванага транзіту ўлады і ўсталявання дэмакратычнай формы кіравання ў Рэспубліцы Беларусь.*

*Наша мэта — дэмакратычная, вольная, еўрапейская, незалежная Беларусь!*

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ!
АДКАЗНАСЦЬ!
СВАБОДА!

ПАДТРЫМАЙ НАС!